View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

*І.М. Гоўзіч (Мінск, Беларусь)*

# «ЖЫЦЦЁ ПРАЖЫЦЬ – НЕ ПОЛЕ ПЕРАЙСЦІ» (КНІГА «НАТАЛЕННЕ СМАГІ» ЯК МАСТАЦКАЕ ЎВАСАБЛЕННЕ ДУХОЎНАГА ЖЫЦЦЯ ЯНКІ СІПАКОВА)

Назва кнігі Янкі Сіпакова «Наталенне смагі» ужо сама па сабе з'яўляецца сімвалічнай. Гэта своеасаблівае мастацкае ўвасабленне духоўнага жыцця пісьменніка, які абвострана рэагуе на сацыяльныя і грамадскія змены напрыканцы XX і пачатку XXI стагоддзяў. Звяртае на сябе ўвагу выкарыстанне ў назве кнігі назоўніка «наталенне», што сведчыць няскончаны працэс пазнання жыцця ва ўсёй яго шматграннасці, адметнасці і непаўторнасці, асэнсаванне пачутага і ўбачанага. Тым больш, што пра гэта нагадвае і падзагаловак кнігі – дзённік настрою: *Усё жыццё чалавек запісвае свае думкі на сваёй душы. Тое, што я расказаў тут, запісана на маёй душы. Запісана пачуццямі і ўяўленнем* [1, с. 117].

Вось і сабраныя ў гэтым своеасаблівым дзённіку пераважна сумна-элегічныя і трывожна-роздумныя эсэ і лірычныя мініяцюры, якія «ідуць» ад непасрэдных жыццёвых назіранняў і асабістага вопыту пісьменніка: *Думаю, не толькі мяне аднаго трывожыць вось такое адчуванне: усе мы стаім на тонкім-тонкім воласе, напятым між берагамі, а пад намі дыхае холадам нямеранае на глыбіню прадонне...* [1, с. 5].

Кампазіцыйна «Наталенне смагі» складаецца з пяці не менш сімвалічных па назвах і сэнсавай напоўненасці раздзелаў «Дні за спіною» (1994–1997 гг.), «Паміж сонцам і дажджом» (1998 – 1999 гг.), «Такое сіняе неба» (2000 г.), «Водар дзядоўніку» (2001–2002 гг.), «У Свята Расы» (2003–2005 гг.). Ствараецца ўражанне, што творы кожнай часткі кнігі не толькі аб'ядныя па «храналагічным» прынцыпе, але і групуюцца на аснове тэматычнага падабенства – у кожным з раздзелаў вылучаецца дамінантная праблема ці тэма (хуткаплыннасць жыцця і часу – у першым, неабмежаванасць прасторы для палёту думкі і душы – у другім, чалавек і прырода, зямля і неба – у трэцім, трывога за ўсё існае – у чацвёртым, адчуванне сваіх каранёў, вытокаў – у апошнім). Разам з тым, у кожным з іх назіраецца паўтарэнне і раскрыццё на якасна новым узроўні дамінантных для ўсёй творчасці Янкі Сіпакова тэм (уласцівых не толькі гэтай кнізе): асэнсаванне жыцця, ва ўсіх яго праявах і зменлівасці; усведамленне хуткаплыннасць часу; тэма Бацькаўшчыны (у тым ліку і малой радзімы), якая непарыўна звязана з мовай, гісторыяй, культурай, рэлігійным самавызначэннем, літаратурай; узаемаадносіны прыроды і чалавека, жанчыны і мужчыны і інш. З-за падобнага шматтэм'я часам з'яўляецца ўражанне «стракатасці» некаторых частак кнігі, што з лёгкасцю тлумачыцца ўсё тым жа падзагалоўкам – «дзённік настрою».

Пры знаёмстве з эсэ пісьменніка не пакідае думка пра тое, што Янка Сіпакоў належыць да тых выдатных майстроў слова, чые творчасць і лёс непарыўна звязаны з лёсам Радзімы. Глыбіня зместу, унутраная цэласнасць і паслядоўнасць пазіцыі мастака, арганічная сувязь аб'ектыўнага і суб'ектыўнага, вызначанага яднаннем субстанцыянальнага і асабіста-творчага пачаткаў, уласцівыя шматлікім роздумам пісьменніка пра Бацькаўшчыну, актуальным і ў наш час:

*<...> Ленін пазначыў пяць прыкмет якія лічацца нацыянальнымі каштоўнасцямі: тэрыторыя, культура, этнаграфія, мова, пісьменнасць. Калі адсутнічае хоць адна з гэтых прыкмет, любая этнічная група не можа стаць нацыяй.*

*Цікава, усё гэта ў нас ёсць. Але ж адкуль нечакана бяруцца ўсё новыя і новыя праблемы?!* [1, с. 101].

Або чытаем пра адвечную праблему Беларусі, якая знаходзіцца на «скрыжаванні» інтарэсаў іншых дзяржаў:

*Увесь час некаторыя палякі хочуць зрабіць з беларусаў палякаў.*

*Увесь час некаторыя рускія хочуць зрабіць з беларусаў рускіх.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*І амаль ніхто не хоча памагчы беларусам стаць сапраўднымі беларусамі* [1, с. 101].

Пісьменнік выразна ўсведамляе і папярэджвае будучыя пакаленні, што можа стацца з тым народам, які адрачэцца ад сваёй мовы, гісторыі, памяці продкаў. вобраз мовы, якая валодае ачышчальнай сілай, з'яўляецца адной з асноўных сэнсавых дамінант у кнізе пісьменніка, які ставіць знак роўнасці паміж паняццямі радзіма – народ – мова: *Мова – гэта душа. сваю душу можна выкласці толькі праз сваю мову. чужая мова робіць чужою тваю душу* [1, с. 42]. Мастак упэўнены ў тым, што калі гэты ланцуг разбурыцца, то разбурыцца сістэма спрадвечных каштоўнасцей, загіне род: *Нельга здзекавацца ні з якой мовы на зямлі. пацяшацца з яе. грэбаваць ёю. забараняць яе. нават калі на ёй гаворыць толькі дзесяць чалавек. бо кожная мова – святая* [1, с. 100].

Амаль кожнае эсэ ў кнізе янкі сіпакова насычана медытатыўнасцю, што лучыцца з глыбінным псіхалагізмам, мае абавязковы выхад з лакальнага перажывання і асабістага пачуцця на ўсеагульны драматызм і ўніверсальную трывогу як своеасаблівыя каталізатары дыялогавасці, шматгалосся і разнавектарнасці прэзентаваных чытачу твораў. таму ў кожным раздзеле кнігі становіцца відавочнай градацыя пачуццяў лірычнага героя ад радасці да суму, ад светлага да цёмнага (як назва раздзела «паміж сонцам і дажджом») і наадварот. напэўна таму, часта адчуваецца «выпадзенне» з часу, рух не ў нагу з ходам гістарычных падзей пісьменніка:

*Мы спяшаемся жыць.*

*Спыніся хоць калі чалавеча. азірніся на прыгажосць усяго, што ля цябе над табою, пад табой. пастой, паглядзі, падумай. <...>*

*Жыццё – гэта нейкі шырокі і бясконцы транспарцёр, своеасаблівы перпетум-мобіл*е [1, с. 123].

Янка Сіпакоў паўстае ў такога роду творах філосафам, які глыбока пазнае сябе і свет, спасцігае складаныя праблемы чалавечага існавання, жыцця. асновай падобных твораў становяцца перажыванні сумленнага чалавека, які бачыць, як драбнеюць людзі, іх пачуцці, як паддаюцца яны спакусе лёгкага і бязбеднага жыцця: *Сярод мноства розных падзелаў людзі, мне здаецца, падзяляюцца яшчэ на дзве, ці не самы галоўныя, катэгорыі: на тых, хто крадзе грошы, і на тых, у каго іх крадуць* [1, с. 28], *Зараз некаторыя з азвярэннем узяліся разбураць інтэлігентнасць, высакароднасць, культуру ў чалавеку, ведаючы. што разбураючы ўсё гэта. яны разбураць і самога чалавека* [1, с. 28–29], *Сумленным быць сёння непрыстойна* [1, с. 15].

Праз усю творчасць пісьменніка праходзіць думка пра асобу як вяршыню «жыццятворчасці» (антрапацэнтрызм) і прыроду (сусвет) як крыніцу чалавека і іх узаемадзеянне:

*Чалавек – гэта і ёсць сам космас, сама бясконцасць. маючы рэальнае, абмежаванае памерам цела, ён той жа час бясконцы.*

*Бо позірк яго бясконцы, голас – бясконцы, думка бясконцая <...>.*

*Бо рукі яго бясконцыя <...>.*

*Бо мара яго бясконцая <...>.*

*Чалавек замінае космасу <...>.*

*Чалавек лішні космасу. сусвет бясконцы, і чалавек таксама бясконцы. таму і лішні. накладзеныя адно на адно, яны ўзаемавыключаюцца.*

*Чалавек не павінен зразумець бясконцасць. бо як толькі ён зразумее яе, адразу ж, здаецца разбурыць сусвет, а заадно і сябе – двайніка сусвету* [1, с. 61–62].

У прыведзеным урыўку з эсэ пісьменніка разгортваецца тэзіс пра супрацьстаянне чалавека, які заўсёды імкнецца стаць звышчалавекам, і сусвету. магчыма таму, дастаткова часта ў кнізе паўстае вобраз разбуранай хаты як сімвал адыходу ад традыцыйнага прыродаўладакаванага жыцця да тэхнізаванага, пры якім адчуваецца выразнае супрацьпастаўленне вёска – горад. У падобных творах выразна гучыць голас аўтара – сына

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вёскі, які імкнецца пры кожным зручным выпадку да вытокаў, каранёў, да прыгажосці нерушнага, спрадвечнага, гарманічнага, асвечанага векавымі традыцыямі народнага, бацькавага і матчынага жыцця:

*Я развітваўся з хатаю, як з самым дарагім мне чалавекам. <...>*

*Сціскаецца сэрца. пад горла падварочваецца даўкі камяк, і я доўга мучу і сябе, і горла перад тым як сказаць хаце «бывай», замест такога звыклага:*

*– Да пабачэння, хата! чакай нас...* [1, с. 55–56].

Вялікая ўвага ў кнізе надаецца невялікім лірычным мініяцюрам. наяўнасць якіх выклікана антрапамарфізмам светабачання пісьменніка (*Крыніца – бог, дрэва – бог, возера – бог, камень, у якім, канечне ж, ёсць душа, – таксама бог...* [1, с. 59]), калі неадухоўленыя з'явы прыпадабняюцца пачуццям і ўласцівасцям чалавека, пераносяцца на яго духоўнае жыццё. Вобразны свет, створаны Янкам Сіпаковым «разгорнуты», шматгранны, вытрыманы ў розных колерах, маляўнічы, ў ім многае трымаецца на слове, на фарбе, на гуку. У падобных творах пісьменнік ідзе шляхам канцэнтрацыі думак, пачуццяў, сэнсу ў творах, сінтэзу многіх пачаткаў у адным цэлым, выяўлення на малой плошчы шматзначнага, яскравага, характэрнага: *У лісту гусялапкі алмазна зіхацела сіне-блакітная расіна – як вытанчаная незабудка* [1, с. 15]. Многія лірычныя мініяцюры Янкі Сіпакова становяцца паяднаннем суб'ектыўнага і «аб'ектыўнага», лірыка-эмацыйнага і інтэлектуальна-філасофскага, дакументальнага і фантазійнага пачаткаў. У іх вызначыліся такія рысы творчасці Янкі Сіпакова, як лірызм, павышаная пачуццёвасць лірычнага героя, асацыятыўнасць вобразнасці, маналагічная апавядальнасць.

Частка лірычных мініяцюр Янкі Сіпакова набліжаецца да такога старажытнага жанру, як прытча (эталагічны, павучальны жанр, які мае вытокі яшчэ ў Бібліі), які грунтуецца на мастацкіх прынцыпах іншасказальнасці, упадабнення, перанясення прыкметаў з адных з'яваў і прадметаў на другія і значнага абагульнення, у якім не апошняе месца займаюць мараль, дыдактычная выснова, сэнсавая падтэкставасць:

*Поўдзень. Цвіце магнолія. Свежыя-свежыя-чыстыя-чыстыя, белыя-белыя пялёсткі. Вялікія. Ядраныя.*

*Праз некалькі дзён з гэтай прыгажосці астаюцца толькі карычневыя, разлапістыя шкамуты <...>.*

*Учора – сама прыгажосць, а сёння – нікому не патрэбнае смецце.*

*Во такое яно – жыццё...* [1, с. 178].

Кніга Янкі Сіпакова «Наталенне смагі» – чарговае пацверджанне тэзісу пра тое, што пісьменнік – адзін з лепшых прадстаўнікоў сучаснай беларускай літаратуры, і тыя асаблівасці, заканамернасці і тэндэнцыі, якія рухаюць развіццё сённяшняга слоўнага мастацтва ўперад, уласцівы і лепшым узорам творчасці Я. Сіпакова, які, нажаль, ужо сышоў з жыцця.

*Літаратура*

1. Сіпакоў, Я. Наталенне смагі: дзённік настрою / Я. Сіпакоў. – Мн.: Чатыры чвэрц., 2003.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ